# Гомельскі універсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 31 (818) | Аўторак, 26 лістапада 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.

## НА СЕСІІ АБЛАСНОГА САВЕТА

21—22 лістапада праходзіла VII сесія абласнога Савета народных дэпутатаў. Адным з вынесеных на разгляд пытанняў было «Аб задачах савецкіх і гаспадарчых органаў вобласці па паляпшэнню аховы здароўя насельніцтва ва ўмовах новага гаспадарчага механізма». У яго абмеркаванні прыняў удзел і народны дэпутат аблсавета прарэктар па завочнаму навучанню нашага універсітэта М. М. Воінаў. Ніжэй мы змяшчаем яго выступленне на сесіі.

НА РАЗГЛЯД нашай сесіі ўнесена надзвычай актуальная праблема. Яна вострая для ўсяго народа Беларусі, але асабліва для людзей Гомельшчыны, якую найбольш ахутала чорнае крыло чарнобыльскай бяды. Не мінула яна і студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкі састаў нашага універсітэта. За 5 паслячарнобыльскіх гадоў універсітэт пакінула вялікая колькасць супрацоўнікаў, у тым ліку дактароў і кандыдатаў навук. Але не плакацца я выйшаў на высокую трыбуну. Думаю, хопіць слёз, хопіць слоў. Патрэбны справы. Бо паслухаеш дэпутатаў, другіх людзей — праблем усюды хоць адбаўляй, а вырашаць іх каму? Проста канстатаваць пра дрэннае медыцынскае абслугоўванне сёння і прыкра, і надакучыла.

Я разумею, у якіх складаных умовах знаходзіцца вобласць, яе бюджэт у выніку развалу ў нашай краіне, якая фактычна на нашых вачах амаль развалілася. Я разумею, што зараз вельмі цяжка прасіць, бо няма адкуль даваць, але засяродзіць вашу ўвагу на праблемах аздараўлення студэнцкай моладзі я мушу. І перш за ўсё, што ў вялікім, аж на 9-ці старонках, праекце нашага рашэння я не знайшоў слова студэнт ці выкладчык. А ў нашай вобласці навучаецца кожны трэці чалавек. А навучаюць іх больш за 30 тысяч настаўнікаў, выкладчыкаў. Стан здароўя іх з кожным годам, на жаль, не паляпшаецца. У гэтым годзе, да прыкладу, абследавалі больш за тысячу супрацоўнікаў нашага універсітэта, заплаціўшы за гэта паліклініцы будаўнікоў амаль па 80 руб. за чалавека. Выявілася, што кожны другі мае патрэбу ў лячэнні. У будучым годзе мы плануем абследаваць 4 тысячы нашых студэнтаў. Праўда, не ведаем, дзе знайсці сродкі ці спонсараў, каб выдаткаваць на гэта амаль 300 тыс. руб.

Варта сказаць, што ў плане аздараўлення ў нас робіцца нямала. Толькі ў гэтым годзе па пуцёўках адпачыла 450 супрацоўнікаў і больш тысячы студэнтаў. Ёсць у нас і ўласны вопыт. Больш 15 гадоў пры універсітэце працуе свой санаторый-прафілакторый, у якім штогод адпачывае і лечыцца больш за 1100 супрацоўнікаў і студэнтаў. Карыстаецца ён вялікай папулярнасцю, хаця на лячэнне яго пацыентаў адпускаецца аж 2 (!) кап. на чалавека ў дзень. Пры гэтым, я думаю, што кожны разумее: 2 кап. узору 1975 года былі больш важкімі, чым сённяшнія. Што паробіш, рыначныя цэны растуць, а старыя інструкцыі ўсё яшчэ працуюць.

Зараз пры вялікай дапамозе аблвыканкама і абласнога аб'яднання прафсаюзаў універсітэт набыў будынак для пашырэння санаторыя-прафілакторыя і арганізацыі на яго базе аздараўленчага цэнтра. У ім было б магчымым рабіць прафілактычны агляд студэнтаў іншых ВНУ і навучэнцаў тэхнікумаў. Ужо набыта для яго сучаснае медыцынскае абсталяванне. Хацелася б, каб будаўнічыя арганізацыі хутчэй зрабілі неабходны рамонт, а адпаведныя службы аблвыканкама дапамаглі набыць мэблю, мяккі інвентар. Пажадана было б, каб нанава ствараемае ўпраўленне аховы здароўя прыязна паглядзела ў бок універсітэта. Цікавасць да цэнтра ўзрасце і таму, што з гэтага года пры факультэце фізічнай культуры адкрыта новая спецыялізацыя «Масаж і лячэбная фізкультура». Дарэчы, пра наш факультэт. Гаворачы пра здароўе дзяцей, ніяк не абыдзешся без настаўніка фізкультуры. Штогод у нас выпускаецца звыш 100 кваліфікаваных выкладчыкаў фізкультуры. Студэнты і выкладчыкі абараняюць гонар вобласці на спаборніцтвах рознага ўзроўню. Ёсць чэмпіёны, пераможцы і прызёры Алімпійскіх гульняў, свету. Але база наша не адпавядае сучасным патрабаванням. Ва універсітэце ёсць праект спартыўнага комплексу, ёсць сродкі на будаўніцтва. Але аблвыканкам ніяк не можа дамовіцца з будаўнікамі наконт тэрміна будаўніцтва. А варта нагадаць, што такі комплекс неабходны не толькі для універсітэта, але і для горада. У ім змаглі б умацоўваць сваё здароўе тысячы гамяльчан. Думаю, што аздаравіць членаў нашага калектыву дапаможа і база, якую мы робім у г. Імпілахці, што ў Карэліі. Мясцовы гарсавет падараваў нам будынак школы-інтэрната. Зараз там заканчваюцца аддзелачныя работы.

Дамовіліся мы і з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, які будзе выдзяляць нам месцы на сваёй базе адпачынку, што пад Мінскам. Прапануе нам паслугі і Віцебскі педагагічны інстытут. Але ўсё гэта робіцца намаганнямі асобных ініцыятыўных людзей. А тут хацелася б пэўнай сістэмы работы.

Безумоўна, праблем па ахове здароўя вучнёўскай моладзі, студэнтаў шмат. Рашаць іх трэба, і без прамаруджвання.

*Стыпендыят вучонага савета*



## У ВЫБАРЫ НЕ ПАМЫЛІЎСЯ

З першых жа мінут знаёмства з Андрэем адчуваеш: гэта чалавек цікавы як поглядамі на сваю будучую прафесію эколага-геафізіка, роля якой асабліва ў апошні час надзвычай узрасла, так і наогул сваёй жыццёвай пазіцыяй.

Чацвёртакурснік геафака Андрэй Гусеў — адзін з лепшых студэнтаў факультэта, і сёлета яму назначана стыпендыя вучонага савета ГДУ. Выбар будучай прафесіі ён зрабіў сам — без парад, падказак бацькоў і знаёмых. Па волі лёсу А. Гусеў пасля заканчэння дзесяцігодкі ў г. Туле разам з бацькамі апынуўся ў Беларусі, на Гомельшчыне. Падаў дакументы на геалагічны факультэт Гомельскага дзяржуніверсітэта не таму, што конкурс тут невысокі і можна было стаць студэнтам без асаблівага напружання на ўступных экзаменах. Усё вырашыла яго вялікая цікавасць да навукі аб Зямлі.

Андрэй вучыцца выдатна, але, як ён лічыць, адны толькі пяцёркі не могуць даць яму ўсяго таго, што неабходна для дасканалага авалодання абранай спецыяльнасцю. Якімі б ні былі па ўзроўню лекцыі выкладчыкаў, матэрыяльна-тэхнічная база факультэта — не толькі гэта ўплывае на падрыхтоўку спецыяліста. Патрэбна яшчэ асабістая цікавасць да ведаў самога студэнта, без яе, на думку Андрэя, справа значна ўскладняецца. Ён не з тых, хто чакае ўсяго гатовага, а сам у пастаянным пошуку. Вось чаму з першых гадоў вучобы спрабуе сябе ў навукова-даследчай рабоце. Летам, пасля заканчэння другога курса, разам з асістэнтам кафедры геафізікі А. М. Гуменам пачаў вывучаць варыяцыі геафізічных палёў Аляксандраўскай нафтавай плошчы (Рэчыцкі раён), што ў далейшым перарасло ў адкрыццё кафедральнай гаспдагаворнай тэмы па гэтай тэматыцы, праца над якой паспяхова завяршаецца. Займаўся і іншымі навуковымі распрацоўкамі.

Экалагічная геафізіка — спецыялізацыя ў нашым універсітэце новая, адкрытая толькі ў гэтым навучальным годзе. Чаму Андрэй спыніў свой выбар менавіта на ёй? Тлумачыць гэта трывогай і занепакоенасцю, якія ўзніклі ў яго ў час летняй працы пасля другога курса ў сейсмапартыі на Гомельшчыне, а таксама пасля сёлетняй вытворчай практыкі, якую давялося праходзіць у далёкай Якуціі. Юнак асабліва адчуў, як геолагі — разведчыкі нетраў і здабытчыкі каштоўных карысных выкапняў — нанеслі і працягваюць наносіць прыродзе вялікі ўрон і страты. На ўласныя вочы бачыў скалечаную сібірскую тайгу, жахлівы стан рэк, у якіх гіне рыба... Душа юнака не магла спакойна ўспрымаць такое. Не менш праблем і ў Беларусі, і на Гомельшчыне, у прыватнасці, дзе таксама здабываюцца нафта, газ і не без шкодных экалагічных вынікаў. А Чарнобыль дадаў яшчэ праблем. Таму падрыхтоўка спецыялістаў, якія будуць працаваць у галіне кантролю хімічнага і радыёнукліднага забруджвання глебы, падземных вод, вывучэння міграцыі радыёнуклідаў, нафтапрадуктаў, шламаў, солеадвалаў, надзвычай актуальная і патрэбная. Будучым эколагам-геафізікам, сярод якіх і Андрэй Гусеў, сапраўды хопіць, каб як мага найменшымі былі страты ў нашай прыродзе.

**Т. НІКАЛАЕВА.**

НА ЗДЫМКУ: Андрэй Гусеў.

Фота **У. Чысціка.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта горача віншуюць першага прарэктара — прарэктара па вучэбнай рабоце СЕЛЬКІНА Міхаіла Васільевіча з прысваеннем яму Дзяржкамадукацыяй СССР вучонага звання прафесар.**

• • •

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры оптыкі ГАДЛЕЎСКУЮ Ганну Мікалаеўну (навуковыя кіраўнікі — прафесар Сердзюкоў А. М., дацэнт Капшай В. М.), старшага выкладчыка кафедры фізічнай метралогіі СЕРГІЕНКУ Міхаіла Іванавіча (навуковыя кіраўнікі — акадэмік Беларускай Акадэміі навук Бокуць Б. В., намеснік дырэктара ІФ БАН Казак М. С.) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук; асістэнта кафедры аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі ДЗЕМІДЗЕНКУ Алега Міхайлавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.

